# СЛОВА ПРЫНЁМАННЯ: ГОЛАС ЮНАЦТВА

**Увазе наведвальнікаў афіцыйнага інтэрнет-сайта Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі – творчасць удзельнікаў абласнога семінара маладых літаратараў Гродзеншчыны, які адбыўся ў Гродне 25 мая 2024 года і стаў пачаткам новай старонкі ў літаратурным жыцці Прынёманскага краю.**

Удзельнікі праекта прадстаўляюць абласны цэнтр і некалькі раёнаў: паэт, празаік, драматург Андрэй Дарожкін і паэтэса Вольга Алізар (Гродна); празаік Наталля Лабеева (Слонім); паэтэса, эсэіст Вольга Навіцкая (Ваўкавыскі раён); паэтэса Вераніка Саўко (Зэльвенскі раён); паэтэса, эсэіст, перакладчык Ксенія Урбановіч (Свіслацкі раён); паэтэса Ангеліна Янкелайць (Воранаўскі раён) і празаік Алена Запаснік (Воранаўскі раён).

…Яны вельмі сціплыя. Таму што яшчэ нясмелыя. Хоць вопыт ва ўсіх адрозніваецца. Хтосьці ўжо мае выдадзеныя кнігі, публікацыі ў друку, перамогі ў прэстыжных конкурсах. А хтосьці толькі пачаў гэты сакральны шлях у мастацтва. Якім ён будзе – шмат у чым залежыць ад нас, дарослых, старэйшых калег. …У канцы мая бягучага года Гродзенскім аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі ў горадзе над Нёманам арганізаваны і праведзены абласны семінар маладых літаратараў. Мы ўсе шчыра зацікаўлены ў падтрымцы мастацтва маладых, таму што ўскладаем на іх вялікія надзеі. Дарагія юныя калегі, наперадзе цэлае жыццё. Вас чакаюць наша багатая культурная спадчына, наша шырокая грамадскасць, такая патрабавальная і прынцыповая. І вядома ж, вас чакае галоўная дзеючая асоба літаратурнага працэсу – чытач, без якога няма сэнсу ўсё гэта пачынаць. Ваш выхад!

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На здымках:** удзельнікі абласнога семінара маладых літаратараў Гродзеншчыны (Гродна, Цэнтральная гарадская бібліятэка імя А. Макаёнка. 25 мая 2024 года).

**Андрэй ДАРОЖКІН**
*(г. Гродна)*



# НАПЭЎНА, ПАСТАЛЕЎ

То не дзень выгарае заўзята —
то без колеру вочы, валоссе...
Не зацягне ў будзённае свята
незнаёмых людзей шматгалоссе.

Не спяваю я ў велічным хоры,
што забыўся на ўласную веліч.
Ды і сольна, аб шчасці і горы,
не ўзгадаю ўжо песень тых безліч.

Я міжволі ўглядаюся ў шэрань:
ці то хмары, ці то пустазёлкі —
вочы хлопца стускнелі, яшчэ ў рань,
без блакіту ва ўсмешцы вясёлкі.

Валасы? Ззялі іскрамі жыта,
што злівалася з сонцам на ўзбоччы.
Ні віхурчыка ў іх не спавіта —
ды сцямнелі, як вуліцы ўночы.

Адбярыце, што сэрцу заўгодна
для свайго і майго дабрабыту,
ды пакіньце з усмешкай лагоднай
промень сонца і трошкі блакіту...

# ХАБАР ХМАРАМ

Як здолеў адшукаць цябе між тысяч зорак,
калі яны, як ты, ліюць святло на нас?
Штоноч выходзіў я на ўтоены падворак:
пакуль суседзі спяць — для нас патрэбны час.

«Ды дзе ж цябе знайсці?» Навокал ціха-ціха.
Бы кот з мільготкай спінай, лашчыцца туман.
Дарэмна ўсё? Іх шмат? То для мяне не ліха.
Паволі вочы ўзняў: «Адкуль чакаць падман?»

А зорак не відаць, бо хмары неба скралі!
Ніколі, ты павер, так цёмна не было.
Я за цябе аддаў са слоў сваіх каралі —
не згіну, далібог, бо ёсць тваё святло.



**Вольга АЛІЗАР**
*(г. Гродна)*

## ЧАРНАВІК НЕ ПАТРЭБЕН

Раз у год у акно заглядае вясна,
Раз у год у краіну вяртаюцца птушкі.
Дык навошта пісаць у чарнавік, а пасля
Траціць час, каб раскрыць непатрэбныя дужкі.

Лепей ранкам прачнуцца і выбегчы ў двор,
Што ёсць моцы ўдыхнуць і вясны, і паветра.
Хай адчыніцца сэрцу дзівосны прастор,
Які пахам цудоўным нагадвае лета.

Які кліча сабраць непаўторны букет,
Апрануцца да пятак у розныя фарбы
І прыняць падарунак – шчаслівы білет,
На чароўны маршрут “да матулі і таты”.

А што з вуснаў і крокаў пакласці у кішэнь,
Хай наш лёс самастойна пасля вырашае.
Чарнавік нам, вясна, не патрэбен яшчэ,
А памылімся мы – хай жыццё прабачае…

***

Усюды ходзіць «апрель», а ў нас – «красавік»,
Усюды кажуць «привет», а ў нас – «прывітанне».
Нам вясна прапануе ўзяць чарнавік,
Але зноў выбіраем мы чыстапісанне.

Раз у год у акно заглядае вясна,
Раз у год у краіну вяртаюцца птушкі.
Дык навошта пісаць ў чарнавік, а пасля
Траціць час, каб раскрыць непатрэбныя дужкі.

Лепей ранкам прачнуцца і выйсці ў двор,
Што ёсць моцы ўдыхнуць і вясны, і паветра.
Хай адчыніцца сэрцу дзівосны прастор,
Які пахам цудоўным нагадвае лета,

Які кліча сабраць непаўторны букет,
Апрануцца да пятак у розныя фарбы
І прыняць ў падарунак шчаслівы білет,
На чароўны маршрут «да матулі і таты».

А што з вуснаў і крокаў закінуць ў кішэнь,
Хай наш лёс самастойна пасля вырашае.
Чарнавік нам, вясна, не патрэбен яшчэ,
А памылімся мы – хай жыццё прабачае…

Пакуль мы адчуваем душой маладосць,
Будуць правілы мець не адно выключэнне.
Усюды ходзіць «краса», а ў нас – «прыгажосць»,
Усюды кажуць «пока», а мы – «да пабачэння».

**Ксенія УРБАНОВІЧ**
*(Свіслацкі раён)*



# НА ЗАГУМЕННІ ЗАДУМЕННЯ

Давай цішэй імчаць па полі,
Прамытым летняй малацьбой,
Цішэй варочацца з дарогі,
Усланай летняю расой.
Імчацца жаўранкам маленькім
Па небе сінім наўздагон,
І даражыць адной хвілінай,
Праведзенай з самім сабой.

# АДВЕЧНАЯ ТЭМА

Адвечная тэма: шчасце ў чым?
У грошах, у працы, каханні?
А шчасце прасцей: яно – у жыцці,
Што кожнаму з нас даравана.

Калі ты здаровы і блізкія побач,
Здаецца, ужо болей не трэба.
Ці сонца смяецца, ці  падае дожджык.
І ты ўсміхаешся небу.

Калі ўсё так проста і зразумела,
Можа і крыху банальна,
Шчасце само напаткае цябе:
Кожнаму з нас даравана.

**Вольга НАВІЦКАЯ**
*(Ваўкавыскі раён)*



# ЗВЫЧАЙНІЦА

Я ападаю, як кволы лісток,
Самотна і непаспяхова.
Я п’ю цябе. Ты мой апошні глыток –
Канчаецца наша размова.

Як наша апошняя восень, адна.
Адна я на свеце заўсёды.
Шнарам кладзецца лістоў караван.
На сэрца маё праз нягоды.

Пакутую я. Вечарамі больш мне
Не пішаш… Жыццё маё – вязніца.
Не прыйдзеш сцяжынаю ты да мяне.
Дык хто ж для цябе я?! Звычайніца.

# ЛЁСАВЫЗНАЧАЛЬНАЯ ВЯСНА

Гэта вясна наш лёс вызначае.
Песціць і цешыць усмешку маю.
І лёс наш шчаслівым быць абяцае,
Як моцна трымаеш руку ты маю.

Вочы блішчаць, быццам бы дыяменты.
Позірк кідаюць ласкавы на твар.
Гучаць нам з табою апладысменты,
Як мы праходзім прыгожы бульвар.

Гэта ж апладысменты каханню,
Што злітавала нас у адно.
Шчаслівая, веру твайму я прызнанню,
Нібы не ў рэальнасці я, а ў кіно.

Твае пацалункі – бы сонейкі ў жыце.
І рукі твае – гэта воблакаў пух.
Ты радасць мне дорыш, я – бы ў аксаміце.
І веру ў вечны кахання наш рух.



**Вераніка САЎКО**
*(Зэльвенскі раён)*

# МАЁ ШЧАСЦЕ

Я называю сябе шчаслівай,
Асабліва, калі я побач з табой.
Ты кахаеш мяне з такой сілай,
Што душа набывае спакой.

Люблю ўсюды з табою гуляць,
Вечарам, днём, нават ноччу.
Мы бачым, як зоркі над намі ляцяць,
І з нечага пастаянна хахочам.

Падары мне яшчэ адзін пацалунак
Пад зорным небам чароўным.
Паслаў мне сам лёс цябе ў падарунак,
У жыцці зрабіў самым галоўным!



**Ангеліна ЯНКЕЛАЙЦЬ**
*(Воранаўскі раён)*

# СКАРБ КУПАЛЫ

Людзі няспынна ідуць да Купалы
З букетамі пышнымі руж у руках…
Сказаць шчыры «дзякуй», даніну пашаны
Аддаць за любоў да Радзімы ў радках.

Твораў паэта, вядомага ў свеце,
Словы, як полымя, у сэрцах гарацЬ.
Ісціну ў кожным яго запавеце
Спевам птушыным усюды чуваць.

Мы захаваем той скарб, што пакінуў
Ты нам малітвай за родны загон,
Роднаму слову, што сказана сынам,
Сынам народа, – нізкі паклон!



**Наталля ЛАБЕЕВА**
*(г. Слонім)*

# АСНОВА

*прытча*

Пад зямлёй цякла Рака. Кожная кропелька ў ёй обмывала пясчынкі ды маленькія каменчыкі. Кожнаму каменчыку хацелася быць ў яе рэчышчы. Але людзі не ведалі аб гэтай Рацэ, ды і не патрэбна была яна ім, бо навокал столькі наземных рэк!

У тым месцы, дзе была сярэдзіна Ракі, людзі вырашылі пабудаваць Вежу з прыгожымі балконамі. Убачыўшы сваю вышыню і красу, заганарылася Вежа, ды кажа:

– Да нябёсаў дастаюць рукі мае, на высокія аблокі глядзяць вочы-вокны мае. Я самая высокая, самая прыгожая!

Пачула гэта Рака і спакойна адказвае ёй шолахам хваляў сваіх:

–Я трымаю на сваёй спіне пласты зямлі, а яны трымаюць цябе.

Але не слухала Вежа, ды не разумела слоў Ракі.

– Ніхто мяне не трымае. Я сама сябе трымаю. Людзі зрабілі фундамент мой, на ім я і стаю, – смеючыся адказала Вежа.

Горка стала Рацэ, сышла яна глыбока ў зямлю. А ў гэты час Вежа раптам, як ад ветру, нахілілася ўбок.

Зямля пакінула яе, таму што не стала самага галоўнага, сціплага, нябачнага вачам, але такого значнага – падземнай Ракі – асновы пластоў зямлі.

Вежа не змагала гэтак доўга прастаяць. Праз месяц яна пачала руйнавацца. Прайшло зусім няшмат часу, і яна назаўсёды абрушылася на зямлю. Засталіся пасля яе толькі каменні ды пыл. Пласты зямлі сышлі глыбока ўніз, акуратна ды гарманічна ускладзіся яны на аснову.



**Алена ЗАПАСНІК**
*(Воранаўскі раён)*

# ХТО Ў ЛЕСЕ САМЫ ДЗІЎНЫ?

*казка*

Гэтую дзіўную гісторыю мне распавёў вецер.

Здарылася гэтая гісторыя ў дрымучых лясах Белавежскай пушчы. Аднойчы звяры і расліны пачалі спрачацца – хто з іх самы ўнікальны і дзіўны, хто патрабуе асаблівай увагі і клопату.

– Я, напрыклад, магу залазіць на самыя высокія дрэвы, – казала Еўрапейская Рысь. – Раблю вялікія скачкі, – лясная кошка нагнулася, быццам гатовая да скачка, але працягнула свой аповед, – І добра плаваць. – Яна села на заднія лапы і пачала ўмывацца.

Стары Буры Мядзведзь адказаў:

– Я хоць і нязграбны на першы погляд, але таксама выдатны бягун, а ў маладосці ўмеў добра лазіць па дрэвах і здабываць мёд.

Тады Зубр важна строс барадой і горда сказаў:

– Мы, Зубры – цары леса і лічымся сімвалам Беларусі.

У лесе запанавала цішыня, але гэта маўчанне нечакана парушыў Філін:

– Вось я – вельмі карысная птушка-драпежнік! А мой палёт такі бясшумны і плаўны, што дапамагае мне выдатна паляваць у начны час на шкоднікаў лесу. Пры гэтым мы, філіны, вельмі дружныя птушкі, – давольна чмыхнуў апавядальнік.

– А вось я магу радаваць слых выдатнай трэллю з шапатлівымі гукамі, – шчабятаў Жаўрук Чубаты. – А яшчэ я магу пераймаць гукі іншых птушак і нават звяроў.

– Затое маё глянцава-блакітнае апярэнне ў промнях летняга сонца робіць мяне падобным на бліскучы смарагд, – перапыніў яго Зімародак Звычайны.

Але Апалон Чорны запярэчыў:

– А я ўмею шыпець. Ніхто з матылькоў так не можа. Толькі я так магу.

Тут Чмель Імхавы прапанаваў:

– Давайце паслухаем кветкі, што яны скажуць.

– Я магу вырасці ў вышыню дарослага чалавека! – празвінеў Званочак Шыракалісты. – А на свята Івана-Купалу мы, званочкі, напаўняем лясы і лугі дзіўным звонам “дзінь-дзінь”, – і ён весела зазвінеў блакітнавата-бэзавымі кветкамі.
– А я – Арэх Вадзянік. Убачыш мяне на паверхні вадаёма – значыць, вада тут чыстая!
Але тут Гарлачык Белы запярэчыў:
– Але я куды лепей! Як толькі перад самым усходам сонца, сонечныя праменьчыкі ледзь закрануць паверхні вады, мае асляпляльна-белыя пялёсткі адразу абуджаюцца! А форма майго ліста нагадвае сэрца! Мяне часта імкнуцца сарваць. Як толькі да мяне дакрануцца злыя рукі, я адразу загіну. – Гарлачык сумна апусціў галаву.
Тут Ветрагонка Лясная пакрыўджана сказала:
– Але я куды мякчэй за цябе: калі мяне захочуць сарваць – дык выцягнуць разам з карэннем. Я адразу загіну! – І Ветрагонка Лясная заплакала.
– Затое я самая прыгожая архідэя нашага лесу! – Сказаў Венерын Чаравічак. – Мае кветкі нагадваюць жаночы туфлік ярка-жоўтага колеру з чырванавата-бурымі завязкамі.
– Заўважце, гэтая лясная прыгажуня вельмі пераборлівая! Яна любіць хавацца ў цені і не можа цярпець яркага святла, – запрыкмеціў Жаўрук. – Глеба ёй патрэбна добра ўвільготненая і багатая пажыўнымі рэчывамі.
– Гэта для таго, каб я магла падказаць месца, дзе знаходзяцца карысныя выкапні. – Адказаў Венерын Чаравічак.
– Ды і насенне ў яе не ўсё прарастае, а толькі тое, якому пашанцуе, – дадаў Зімародак. – Насенню ў зямлі патрэбны памочнік у выглядзе маленькіх грыбкоў.
– І гэта яшчэ не ўсё, – заўважыў мудры Філін, – нават калі насенню пашанцуе прарасці, першы ліст з'явіцца не раней як праз чатыры гады, а кветкі распусцяцца толькі праз некалькі гадоў.
– Лепей вы паглядзіце на мае лілова-бэзавыя кветкі, што ўпрыгожаны вытанчаным чубком, – выхваляючыся «закудахтала» Чубатка Прамежкавая. – А мой салодкі нектар вельмі прывабны для пчол, матылькоў і чмялёў! А мурашы! Як яны любяць паласавацца маім белым мясістым насеннем. – радавалася Чубатка.
Толькі Першацвет Высокі, які першы вылазіць вясной з-пад снегу, сціпла стаяў у далёкім куце лесу і маўчаў.
Тут нечакана над лесам паказаўся Бусел. Ён праляцеў некалькі колаў у паветры, а потым прызямліўся на лясную палянку, дзе так бурна ішла сярод звяроў, птушак і кветак спрэчка. Бусел нізка ўсім пакланіўся.
– Добры дзень! Добры дзень, Бусел! – усе ў адзін голас дружна яго прывіталі.
Тады магутны Зубр выйшаў з натоўпу_і сказаў:
– Бусел, вырашы нашу спрэчку.
І тады звяры, птушкі і кветкі агучылі яму свой аповед.
Бусел, уважліва выслухаўшы, адказаў:
– Я, Бусел, высока лётаю, усё ведаю. Чуў я, што людзі ствараюць адмысловыя запаведнікі і нацыянальныя паркі, для таго, каб абараніць і зберагчы прыроду,

– і бусел высока падняў уверх крыло з указальным пяром і працягнуў далей: – а рэдкія і выміраючыя віды раслін і жывёл яны заносяць у Чырвоную Кнігу.
– Ого! – усе здзіўлена пераглянуліся – словы бусла іх падбадзёрылі, і яны былі вельмі рады пачутаму.
– Значыць мы ўсе самыя рэдкія і дзіўныя, які патрабуюць асаблівай увагі і клопату! – І лясныя насельнікі прыняліся весела перашэптвацца паміж сабой.
– Гэта так. Так. – Пагадзіўся Зубр. – А мой выгляд – гэта сусветны сімвал прыродаахоўнага руху.

Вядома, у кожнай казцы ёсць мараль. Мараль гэтай казкі такая. Мы, дарагія дзеткі, павінны беражліва ставіцца да раслін і жывёл, не зрываць кветак, не выкручваць хмызнякі і дрэвы, не забіваць звяроў. Хай яны заўсёды радуюць нас сваёй прыгажосцю. Гэта ўсё – наша багацце: магутныя зялёныя лясы, сінявокія азёры, блакітныя рэкі, чыстыя вадаёмы і сінія валошкі на палях. Дык давайце захаваем усё гэтае багацце, каб яно і далей радавала ўсіх, заставался годнасцю нашай Радзімы!

